БУДОЎЛІ ПЯЦІГОДКІ — ПАД КАНТРОЛЬ!

# Поспехі нашы і хваляванні

Трэці калійны камбінат пашырае свае межы. І не толькі на паверхні, але і ў глыбіні, на адметцы 420 метраў. На рудніку ўжо пройдзены збойка паміж першым і другім ствaламі, камера цэнтральнай падземнай падстанцыі, камеры медпункта, дыспетчара, чакання і іншыя выпрацоўкі. За апошнія пяць месяцаў выдадзена на паверхню каля 10 тысяч кубаметраў горнай масы. Заўважу, што для поўнага заканчэння работ па распрацоўцы руднічнага двара патрэбна выняць каля 30 тысяч кубаметраў пароды.

Як бачыце, задача перад гарнякамі стаіць адказная, тым больш, што тэрміны яе заканчэня — у трэцім квартале сёлетняга года. Пасля гэтага на паверхню паступяць першыя тоны сільвінітавай руды, пакуль жа выпрацаваная маса ідзе з шахты проста на солеадвалы.

Раней на рудніку працавала адна бураўзрыўная брыгада, якой кіруе бывалы гарняк Іван Несцеравіч Кандзярэшка. Пасля спуску ў шахту камбайна ШБМ-2 ім на дапамогу прыйшла брыгада,якую ўзначаліў М. Ларчанка. Пасля гэтага тэмпы работ выраслі ўдвая. Калі раней за суткі выпрацоўвалася каля ста кубаметраў пароды, дык цяпер — да двухсот. Дарэчы, у шахце выкарыстоўваюцца тры скрабковыя канвееры і столькі ж скрэперных лябёдак. З дапамогай тэхнікі гарнякі і дабіваюцца нядрэнных працоўных паказчыкаў.

Мы падлічылі, што калі ўсямерна нарошчваць тэмпы праходкі руднічнага двара, можна не толькі ўкласціся ў графік здачы ваколствольных камер у эксплуатацыю, але і перакрыць даведзеныя тэрміны. І вось тут у рабоце гарнякоў не ўсё ідзе гладка. Справа ў тым, што мы працуем па часовай схеме, пакольні не здадзен у эксплуатацыю надшахтны комплекс ствала № 3. Па віне будаўнікоў намечаныя тэрміны пераносіліся некалькі разоў. Мы ж вымушаны працаваць па часовай схеме, што значна стрымлівае ход работ.

Калі б быў здадзен комплекс ствала, мы змаглі б апусціць у шахту яшчэ некалькі горных камбайнаў. Ці трэба гаварыць, што справы тады пайшлі б значна лепш?

У гэтыя дні калектыў вядзе праходку галоўнага транспартнага і галоўнага вентыляцыйнага штрэкаў, выпрацоўваем камеру пад склад гаруча-змазачных матэрыялаў. Гарнякі стараюцца зрабіць як мага больш, наблізіць дзень заканчэння работ па падрыхтоўцы да здабычы сільвініту. У сувязі з гэтым хочацца дабавіць, што для нармальнай работы рудніка неабходна да канца года здаць у эксплуатацыю галоўную вентыляцыйную ўстаноўку. Гарнякі чакаюць гэтага ад калектыву будтрэста № 3. Уступіць яна ў строй да надыходу халадоў. Значыць, можна быць упэўненым, што руда на-гара будзе паступаць беспераболйна.

Адно з «вузкіх» месц на рудніку — адгрузка пароды. Аўтабаза № 5, як правіла,замест 2 машын, заказаных на змену ў заяўцы, прысылае толькі адну. Гэта значыць, што гарнякі вымушаны нярэдка прастойваць. Мы маем магчымасць выдаваць на паверхню за суткі не менш 500 тон горнай масы, а адгружаецца не больш 450 тон. Здаецца, невялікая розніца.Аднак за месяц адставанне вырастае ў значную лічбу, затрымлівае работу на некалькі дзён.

З кожным днём усё далей і далей ідуць гарнякі, пракладваючы дарогу да штурму зямных нетраў. Зроблена ж пакуль што нямнога. Усё галоўнае — наперадзе. І арганізацыі, ад якіх гэта залежыць, павінны сказаць у гэтай справе сваё важкае слова.

**Г. САКАЧ,**
**галоўны інжынер рудніка.**